Вікторыя ХАРЫТОНАВА,
загадчык сектара мастацкіх выставак
аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# 140-ГОДДЗЕ ЯКУБА КОЛАСА Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСІ

Сёлета краіна багатая на юбілеі ў культурнай прасторы. Адзін з іх – 140-годдзе народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Майстар слова зрабіў найзначнейшы ўнёсак у фарміраванне і развіццё беларускай літаратурнай мовы. Грамадскі дзеяч, вучоны, педагог, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, заслужаны дзеяч навукі, Якуб Колас усё жыццё працаваў на ніве нацыянальнай культуры. Яго творы – багатая спадчына – увайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры і вядомы сёння далёка за межамі нашай рэспублікі. Таленавіты паэт, празаік, драматург, настаўнік… Дзякуючы творам Якуба Коласа і сёння мы вучымся чуць сябе і суразмоўцу, глядзець навокал і бачыць, жыць і працаваць.

Да дня нараджэння класіка беларускай літаратуры ладзіліся розныя імпрэзы, у тым ліку і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Кніжныя і мастацкія выстаўкі, мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею і асобе Якуба Коласа, якія праходзілі і праходзяць у чытальных залах і мастацкіх галерэях, карыстаюцца вялікім поспехам у чытачоў і наведвальнікаў бібліятэкі. У гэтым годзе адкрыта літаратурна-мастацкая выстаўка “Песняры зямлі беларускай”, якая распавядае пра жыццё і творчасць народных паэтаў і юбіляраў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Літаратурна-мастацкая выстаўка – адметны фармат знаёмства. У экспазіцыі можна ўбачыць прыжыццёвыя і сучасныя выданні пісьменніка, арыгіналы ілюстрацый да яго твораў, асабістыя рэчы і дакументы. Постаць аўтара паўстае праз прызму яго творчасці, праз адметнасці яго жыцця і побыту, пераасэнсаваныя мастакамі-ілюстратарамі. Для стварэння экспазіцыі задзейнічаны фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Можна ўбачыць выданні прыжыццёвыя, самыя першыя, самыя рэдкія, юбілейныя, з аўтографамі, сучасныя, у перакладзе, з выдатна аформленымі вокладкамі і ілюстрацыямі знакамітых мастакоў, а таксама літаратуру пра жыццё і творчасць песняра. Экспануюцца матэрыялы канферэнцый, зборнікі артыкулаў, выданні па гісторыі беларускай літаратуры, дзе з пазіцыі сучаснасці ацэньваецца спадчына паэта, раскрываецца яе значэнне ў станаўленні майстэрства слова. Шматлікія дакументы знаёмяць з жыццёвай і творчай дарогай пісьменніка. Дэманструюцца першыя выданні Якуба Коласа – “Другое чытанне для дзяцей беларусаў” (Пецярбург, 1909), “Песні-жальбы” (Вільня, 1910), зборнік апавяданняў “Прапаў чалавек” (Пецярбург, 1913), поўнае выданне паэмы “Сымон-музыка” (Мінск, 1925).




**Вокладка зборніка “Выбраныя творы” Якуба Коласа.** Вільня, 1927 г.

Нельга не адзначыць і такія дыяменты творчасці, пададзеныя ў экспазіцыі, як аповесць “Дрыгва”, паэма-эпапея “Новая зямля”, трылогія “На ростанях”, паэма “Міхасёвы прыгоды”, зборнік “Казкі жыцця” і інш. Якуб Колас – адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, аўтар твораў для дзяцей і падручнікаў роднай мовы – на працягу ўсяго жыцця аддаваў пільную ўвагу школе і школьнікам.

Наведвальнікам экспазіцыі будзе цікава пазнаёміцца з 900-старонкавым фаліянтам, дзе знакамітая “Новая зямля” надрукавана на беларускай, рускай і польскай мовах, з “Тлумачаль-

ным слоўнікам адметнай лексікі ў творах Якуба Коласа" Г. Арашонкавай і Н. Чабатар.

Творы Якуба Коласа перакладзены на многія мовы свету. На выстаўцы можна ўбачыць выданні на англійскай, балгарскай, латышскай, літоўскай, малдаўскай, нямецкай, польскай, рускай, румынскай, таджыкскай, туркменскай, украінскай, французскай, эстонскай мовах. Усяго па творчасці Якуба Коласа прапанавана больш за дзве сотні дакументаў з фонду НББ.

Увогуле ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі знаходзіцца больш як чатыры сотні кніг з творамі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа (каля 180 прыжыццёвых выданняў). У тэматычнай базе даных "Беларусь: ад мінулага да сучаснага" можна знайсці больш за тысячу кніг і артыкулаў пра жыццё і творчасць Коласа, захоўваюцца кнігі з аўтографамі і дарчымі надпісамі песняра (тры выданні). Ёсць біяграфічныя даведкі і карысныя спасылкі ў базе даных "Беларусь у асобах і падзеях", у алфавітным каталогу можна адшукаць каля 70 электронных копій прыжыццёвых выданняў пісьменніка. Аддзелам экскурсійна-метадычнай работы падрыхтавана вучэбна-пазнавальная экскурсія "Славутыя імёны Бацькаўшчыны".

Сустрэча (або знаёмства) з Якубам Коласам адбываецца не толькі праз вершаваныя бестселеры савецкага часу, але і праз ілюстрацыі да яго твораў, выкананыя вядомымі беларускімі мастакамі. Графічныя пераасэнсаванні радкоў і сюжэтаў знаёмых паэм, вершаў Васілём Шаранговічам і Георгіем Паплаўскім аздобілі тэксты, дадалі літаратурным героям шчырасці і праўдзівасці, глыбокага і тонкага псіхалагізму.

У экспазіцыі – афорты Георгія Паплаўскага да паэм "Новая зямля", "Сымон-музыка" і вершаў (з фонду НББ). Рамантык суровага стылю, аматар праўдзівага жывапісу Г. Паплаўскі перадае літаратурныя кампазіцыі і рыфмаваныя партрэты яскравымі, кантраснымі контурамі, эпітэтамі арнаментаў, мяккімі плаўнымі лініямі. З графічнай шчырасцю, прамалінейнасцю аўтар дэталёва прамалёўвае сілуэты і характары – паэтычную панараму літаратурнага шэдэўра. У 1968 г. мастацкае афармленне "Новай зямлі" Г. Паплаўскага было адзначана дыпломам "Найпрыгажэйшая кніга свету" на конкурсе ў Лейпцыгу (Германія).

Не пакінуць абыякавымі гледачоў кранальныя акварэлі Васіля Шаранговіча да паэмы "Новая зямля", паэтычныя вобразы "Раніца ў нядзельку", "Вечарамі" і інш. Ярка і маляўніча, тонка і жыва, паэтычна і па-філасофску, неверагодна глыбока мастак перадае адценні сэнсаў, нюансы вобразаў, рысы характараў, каларыт сітуацый, апісаных у паэтычных радках.

Асаблівую атмасферу выстаўцы надаюць рукапісы з аўтографамі пісьменніка, яго асабістыя рэчы і іншыя цікавыя экспанаты з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Экспазіцыя знаёміць з чарнавікамі, тэкстамі прамоваў на з'ездах, выступленнямі, указамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб узнагароджаннях. Дэманструюцца "Пасведчанне Акадэміі навук БССР № 323" (ад 1 жніўня 1949 г.), "Пасведчанне № 148 Вярхоўнага Савета БССР 3-га склікання" (1951) на імя Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа), "Пасведчанне" Якуба Коласа, дэлегата 3-га з'езда савецкіх пісьменнікаў БССР з правам вырашальнага голасу (1954) і інш. Вельмі цікава ўбачыць асабістыя рэчы песняра. Так, акуляры Якуба Коласа і яго прэс-бювар нібыта пераносяць у кабінет народнага паэта, даюць магчымасць уявіць, як нараджаліся вядомыя радкі, старонкі любімых кніг…

Выстаўка "Песняры зямлі беларускай" аддае даніну павагі Якубу Коласу, імкнецца зацікавіць чытачоў яго творамі, малюе яго штодзённы рэальны вобраз, робіць крок да разумення аўтара-чалавека і перадае ўнёсак пісьменніка ў фарміраванне літаратурнай мовы, развіццё мастацкай літаратуры, нацыянальнай культуры. Рэалістычная, філасофская творчасць Якуба Коласа закранула няпростыя перыяды жыцця беларускага народа, узняла вострыя праблемы сучаснасці, распачала беларускую нацыянальную прозу, беларускі раман. Сталі афарызмамі мары мудрага пісьменніка аб лепшай долі, яго думкі пра імкненне да светлага, пра жаданне паляпшаць прастору вакол сябе, вучыцца, паважаць навуку і культуру, родную старонку, родны кут, гісторыю, традыцыі, адметнасць краіны і яе народа.

Літаратурна-мастацкія вобразы, шэдэўры нацыянальнага літаратурнага мастацтва, паказаныя ў экспазіцыі, раскрываюць скіраванасць творчасці пісьменніка. У цэнтры ўвагі аўтара – радзіма. Як сапраўдны прарок, пясняр зямлі беларускай, Якуб Колас здолеў распавесці свету пра Беларусь, пра характар і творчы сусвет беларусаў, надзвычайную сілу і моц роднага слова. А беларусам паказаць, што найкаштоўнейшая ўзнагарода – гэта жыццё, найдаражэйшае багацце – родная мова, што нічога прыгажэйшага за радзіму няма, што шчасце можа быць поўным, калі блізкія людзі шчаслівыя, што гумар, навука, бесперапынны рух і абраная дарога – таксама шчасце.

Выстаўка працуе ў кальцавой галерэі 3-га паверха да 25 снежня 2022 г. Уваход па чытацкім білеце або пропуску сацыякультурнага цэнтра. Запрашаем!